**Урок 57. Уладзімір Караткевіч. “Былі ў мяне мядзведзі”. Непаўторны свет прыроды ў апавяданні**

**Мэты і задачы ўрока:** звярнуць увагу вучняў на рэальна-жыццёвую аснову апавядання Уладзіміра Караткевіча “Былі ў мяне мядзведзі”, займальнасць сюжэту; пазнаёміць вучняў з падзеямі, адлюстраванымі ў творы і яго героямі; развіваць эмацыйную чуйнасць, творчае мысленне, увагу да слова і вобраза; садзейнічаць выхаванню любові і беражлівых адносінаў да непаўторнага свету прыроды праз аналіз твора паўплываць на фарміраванне ўнутранага свету вучняў, іх эмацыянальнага вопыту.

**Апераджальнае заданне** для вучняў — прынесці выявы мядзведзяў і малюнкі прыроды.

**Тып урока** — урок камбінаванай будовы.

**Абсталяванне:** вучэбны дапаможнік «Беларуская літаратура. 5 клас»; карціны прыроды, малюнкі і фотаздымкі мядзведзяў.

**Эпіграф да ўрока**

*Мы ў адказе за тых, каго прыручылі.*

*Антуан дэ Сэнт-Экзюперы*

Ход урока

**1. Арганізацыйны момант**

**2. Праверка дамашняга задання**

—Заслухоўванне сціслых пераказаў кожнай часткі твора Генрыха Далідовіча «Страта» (6 вучняў).

—Конкурс на лепшае вуснае сачыненне-разважанне «Сапраўдныя сябры. Якія яны?» (3–4 вучні).

—Конкурс на лепшы кадраплан апавядання Генрыха Далідовіча «Страта».

**3. Паведамленне тэмы, вызначэнне мэт і задач урока**

**Слова настаўніка з элементамі гутаркі**

Давайце на хвіліну ўявім, што да нас на ўрок прыйшоў карэспандэнт з папулярнага выдання для моладзі і запытаўся: “Ці лічыце вы сябе сябрамі прыроды?” Што б вы адказалі?

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ці былі ў вашым жыцці моманты, калі вы прыходзілі на дапамогу “братам нашым меншым”? Раскажыце пра падобныя выпадкі? Якое пачуццё авалодала вамі ў час дапамогі?

Як вы ставіцеся да тых людзей, хто трымае розных жывёл дома, але да пэўнага часу, пакуль не надакучылі? Як вы думаеце, які далейшы лёс чакае жывёл?

Твор, які мы будзем вывучаць, называецца “Былі ў мяне мядзведзі”. Як вы думаеце, пра будзе апавядацца ў ім?

**Зварот да эпіграфа**

Настаўнік чытае эпіграф да ўрока і просіць вучняў адказаць на пытанні:

Як вы разумееце словы Антуана дэ Сэнт-Экзюперы? Можа нехта з вас ужо чытаў аповесць “Маленькі прынц”? Каму належаць гэтыя словы? Чаму нельга пакідаць тых, каго вы прыручылі, аб кім сталі клапаціцца?

**4. Вывучэнне новага матэрыялу**

**Каменціраванае чытанне тэксту часткамі з абмеркаваннем зместу кожнай з іх**

I. Ад слоў “Бацька мой быў ляснічы” да слоў “А пакуль што я не хачу ехаць туды”.

*1. Што аўтар расказвае нам пра сям’ю героя твора?*

*2. Якім паўстае перад намі галоўны герой апавядання? Што мы даведаліся пра яго дзяцінства?*

II. Ад слоў “А пакуль што я не хачу ехаць туды” да слоў “Э-ех, Сяргейка, розуму ў цябе…”.

*1. Чаму герой апавядання ўжо сталым чалавекам не ездзіць туды, дзе прайшло яго маленства?*

*2. Хто такі Бурык і як ён трапіў у сям’ю ляснічага?*

*3. Як ляснічы паставіўся да дзеянняў палясоўшчыкаў?*

*4. Дайце ацэнку ўчынкам палясоўшчыкаў, якія знайшлі Бурыка.*

*5. Што здзівіла хлопчыка, калі ён зазірнуў у шапку? Як выглядала медзведзяня?*

III. Ад слоў “Э-ех, Сяргейка, розуму ў цябе…” да слоў “…У тое лета я…”.

*1. Як растлумачыў дзед Марка, чаму медзведзяняты нараджаюцца такімі маленькімі?*

*2. Чаму Бурык рос “як на дражджах”, не чакаючы вясны?*

*3. Як паводзіў сябе Бурык у доме?*

*4. Чаму на Бурыка не злаваліся і не каралі яго?*

*5. А як бы вы паставіліся да паводзінаў Бурыка?*

IV. Ад слоў “…У тое лета я…” да слоў “Так мы пражылі лета”.

*1. Чаму Марка стаў браць Бурыка ў лес?*

*2. Як зразумець словы Маркі: “Пакрыўдзілі мы яго”?*

*3. Як Бурык паводзіў сябе ў лесе?*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

V. Ад слоў “Так мы пражылі лета”да слоў “Аднойчы ён да паўсмерці спалохаў нейкіх баб…”.

*1. Як Бурык правёў зіму?*

*2. Ці змяніўся Бурык і яго адносіны да людзей?*

VI. Ад слоў “Аднойчы ён да паўсмерці спалохаў нейкіх баб…”да слоў “Вырашылі адвесці яго ў пятніцу…”.

*1. Як і чаму змяніўся Бурык?*

*2. Хітры разбойнік.*

*3. Якая стыхія была для Бурыка роднай: хата лесніка ці лес?*

VII. Ад слоў “Вырашылі адвесці яго ў пятніцу…”да слоў “Маці дазволіла адвесці мядзведзя…”.

*1. Якая мянушка была ў саўгаснага бугая?*

*2. Хто і як выратаваў Сяргея?*

VIII. Ад слоў “Маці дазволіла адвесці мядзведзя…”да слоў “Праз некалькі тыдняў”.

*1. За колькі кіламетраў адвезлі Бурыка ў лес, каб назаўсёды пакінуць яго там?*

*2. Калі Бурыка вялі ў машыну,чаму маці плакала?*

IX. Ад слоў “Праз некалькі тыдняў…” да канца твора.

*1. Калі Сяргей апошні раз бачыў Бурыка?*

*2. Па чым Сяргей беспамылкова пазнаў Бурыка пры апошняй сустрэчы?*

**Слоўнікава-лексічная работа**

Вучням даецца заданне ўстанавіць адпаведнасць паміж словамі і іх лексічнымі значэннямі.

*Дынастыя* – некалькі пакаленняў, якія з роду ў род наследуюць адну і тую ж прафесію.

*Гаротнае* – нядобрае, сумнае.

*Мастак-анімаліст* – мастак,які малюе жывёл.

*Фенек* – жывёліна сямейства сабачых.

*Гепард* – драпежная жывёліна сямейства кашачых.

*Лапэту* – лапу.

*Кленчыць* – тут: настойліва выпрошваць.

*Палясоўшчык* – ляснік.

*Тытунь* – табака.

*Узагрэў дам* – пакараю.

*Напарстак* – прылада для шыцця, якая апранаецца на палец.

*Мезанін* – невялікая надбудова над сярэдзінай дома.

*Грубка* – маленькая печка.

*Чарнільніца* – прылада для пісьма.

*Заспець на гарачым* – застаць на месцы злачынства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Балея* – вялікая нізкая драўляная або металічная пасудзіна для мыцця бялізны.

*Шпандыр* – рамень, раменны пояс.

*Карбач* – пуга, бізун.

*Намёт* – хуткі бег каня.

*Збыткавацца* – здзекавацца, насміхацца.

*Глінцавая піраміда* – мурашнік; горка, курганок з сасновых шыпулек – гліцы (ігліцы).

*Канючыць* – тут: выпрошваць.

*Шчыкаць* – шчыпаць.

*Смаржкі* – ядомыя грыбы, якія маюць зморшчаную карычневую шапачку.

*Вязы* – шыя.

*Ажаролак* – белая паласа вакол шыі.

*Цыратовая цюпка* – тут: бліскучы, глянцавы кончык носа (*цырата* – тканіна, пакрытая з аднаго боку бліскучым саставам, які робіць яе непрамакальнай; кляёнка).

*Шарачок* – грубая фарбаваная тканіна дамашняга вырабу; тут: вопратка, пашытая з ільнянога палатна,вытканага ў хатніх умовах.

*Вытаргнуў* – выкрыкнуў, гукнуў, адазваўся.

*Завалюхаў* – тут: павольна пакрочыў.

*Урвішча* – тут: круты абрыў.

*Патрыярх* – тут: пачынальнік роду.

**6. Замацаванне вывучанага**

**Эўрыстычная гутарка, выкананне задання**

1. Як вы ставіцеся да палясоўшчыкаў, якія знайшлі Бурыка і прынеслі яго Сяргейку?

2. Што дало Сяргею сяброўства з Бурыкам? Якія станоўчыя рысы характару выхаваліся ў хлопчыка?

3. Ці правільна зрабіў бацька Сяргея, калі вырашыў завезці мядзведзя ў лес?

4. Пра якія звычкі мядзведзяў вы даведаліся з апавядання?

5. Чаму так многа ўвагі Уладзімір Караткевіч надае апісанням прыроды?

**6. Абагульненне**

Складанне алфавітаў

Ч –

А –

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Л –

А –

В –

Е –

К –

П –

Р –

Ы –

Р –

О –

Д –

А –

**7. Падвядзенне вынікаў, выстаўленне адзнак**

**8. Рэфлексія**

Па чарзе кожная чацвёрка выйдзе на нашай мішэні паставіць кропкі ў сектарах.

1. Наколькі спадабалася працаваць.

2. Наколькі вы задаволены працай класа.

3. Наколькі дасягнулі мы мэты урока.

4. Наколькі кожны з вас задаволены сваёй дзейнасцю на ўроку.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**9. Інфармацыя пра дамашняе заданне і інструктаж па яго выкананні**

1. Падрыхтаваць разгорнутыя паведамленні пра першую і апошнюю сустрэчу Сяргея з Бурыкам, можна падрыхтаваць малюнкі гэтых момантаў (па жаданні).

2. Скласці кадраплан твора Уладзіміра Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі». У працэсе работы над кадрапланам выкарыстайце наступную табліцу:

| **Сцэна і яе загаловак** | **Персанажы і адносіны паміж імі** | **Дзеянні, рухі персанажаў** | **Пейзажны фон** | **Музычнае афармленне ці цытаты з тэксту** |
|---|---|---|---|---|
| 1. | | | | |
| 2. | | | | |
| 3. | | | | |
| 4. | | | | |

3. Намалюйце словамі вобраз аднаго з герояў твора Уладзіміра Караткевіча «Былі ў мяне мядзведзі».

У дапамогу

1. Уявіце сваё знешні выгляд героя, яго паводзіны, адносіны да іншых герояў.

2. Уважліва перачытайце ўрыўкі з твора, знайдзіце словы і выразы, якія Вам дапамогуць «намаляваць» вобраз героя.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ